# РАЗВІЦЦЁ І ВЫКАРЫСТАННЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў КІБЕРСПОРЦЕ

*Будняк М. С.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Пятрова Н.Я. – к.філал.н.,дацэнт*

Артыкул прысвечаны развіццю і выкарыстанню беларускай мовы ў кіберспорце. Вызначаецца, што такое кіберспорт, звяртаецца ўвага на агульныя тэндэнцыі яго пашырэння ў Рэспубліцы Беларусь і папулярызацыю беларускай мовы ў гэтай галіне спорту.

У сучасным грамадстве інфармацыйныя тэхналогіі пранікаюць у самыя глыбокія пласты нашага паўсядзённага жыцця, змяняючы звыклыя нам практыкі і выявы ўзаемадзеяння. У кантэксце гэтай лічбавай трансфармацыі значэнне выкарыстання роднай мовы ў анлайн-прасторы становіцца ключавым аспектам культурнай і лінгвістычнай самарэфлексіі. Росквіт інфармацыйных тэхналогій перафарматуе не толькі спосабы абмену інфармацыяй, але і наша ўспрыманне мовы як інструменту камунікацыі. Анлайн-платформы, сацыяльныя сеткі і віртуальныя супольнасці ствараюць новыя ўмовы для ўзаемадзеяння, дзе роля мовы ў лічбавай прасторы становіцца важнай не толькі для перадачы інфармацыі, але і для выражэння культурнай і нацыянальнай ідэнтычнасці. У гэтым кантэксце пытанні развіцця і выкарыстання роднай мовы ў лічбавым асяроддзі становяцца больш актуальнымі. Арэал уплыву інфармацыйных тэхналогій ахоплівае ўсе вялікія сферы нашага жыцця, і разуменне, як мова адаптуецца і пераўтвараецца пад уздзеяннем тэхналагічнай рэвалюцыі, мае ютотнае значэнне для захавання моўнай разнастайнасці і культурнай спадчыны. Адной з галін, дзе іх уплыў асабліва адчувальны, з'яўляецца спорт, у першую чаргу кіберспорт.

Кіберспорт – (англ.: *cybersport, e-Sport, electronic sport*) – від спаборніцкай дзейнасці і спецыяльнай практыкі падрыхтоўкі да спаборніцтваў на аснове камп'ютарных або відэагульняў, дзе гульня дае асяроддзе ўзаемадзеяння аб'ектаў кіравання, забяспечваючы роўныя ўмовы спаборніцтваў чалавека з чалавекам або каманды з камандай. Гэта значыць, кіберспорт гэта набор інтэлектуальных дысцыплін, спаборніцтвы па якіх праходзяць у віртуальнай прасторы [1]. Кіберспорт каштоўны тым, што кожны можа паспрабаваць свае сілы ў той ці іншай дысцыпліне, але ўсё ж і канкурэнцыя ад гэтага вялікая.

Развіццё кіберспорту ў значнай ступені залежыць ад камунікацыі і каардынацыі паміж удзельнікамі гульні, трэнерамі, аналітыкамі і іншымі членамі каманды. Мова ў гэтым кантэксце адыгрывае ключавую ролю, падаючы сродак для абмену інфармацыяй, планавання стратэгій і ўстанаўлення эфектыўнага ўзаемадзеяння паміж удзельнікамі.

Аб развіцці кіберспорту ў цэлым на Беларусі сведчыць стварэнне ў 2002 годзе Беларускай федэрацыі кіберспорту, якая з'яўляецца добраахвотнай незалежнай грамадскай арганізацыяй, створанай на аснове членства ў мэтах сумеснай дзейнасці па правядзенні спартыўнай і спартыўна-масавай работы і папулярызацыі кіберспорту ў Рэспубліцы Беларусь [2], а таксама юнаванне Беларускай асацыяцыі камп'ютарнага спорту, створанай 17 красавіка 2020 г. Апошняя арганізацыя – гэта рэспубліканскаяе аб'яднанне, галоўнай мэтай дзейнасці якой з'яўляецца каардынацыя намаганняў для надання камп'ютарнаму спорту масавага характару і яго далейшага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь [3].

Любая мова ўвесь час знаходзіцца ў стане развіцця і пераўтварэння. На гэты працэс вялікую ролю адыгрываюць змены, якія адбываюцца ў сучаснай інфармацыйнай прасторы і свеце камп'ютарных тэхналогій. Хуткае развіццё інфарматыкі ў наш час спрыяе пастаяннаму папаўненню тэрміналагічнага слоўніка мовы, які патрабуе даследавання і апіюання. У выніку інфармацыйнага прагрэсу, велізарнага патоку разнастайнай навуковай інфармацыі, адбыўся так званы «тэрміналагічны выбух» – рэзкае павелічэнне колькасці новых спецыяльных слоў [4, с. 246]. Паколькі кіберспорт пашыраны на Беларусі, наша нацыянальная мова ўзбагацілася спецыяльнымі адзінкамі мовы, лексічна звязанымі з гэтай сферай. Мноства новых слоў і тэрмінаў, звязаных з гульнявой сферай і кіберспортам, увайшло ў актыўную лексіку беларускай мовы. Прывядзём прыклады спецыяльных слоў з галіны кіберспорту, якія пашыраны ў беларускай мове: *прагеймер, сімулятар, стратэгія, шутар, аім, лан, мета, нуб, нерф, кэдэ, клатч* і інш.

Большасць слоў, якія выкарыстоўваюцца ў гульнявым слэнгу, з'яўляецца запазычаннямі з англійскай мовы, напрыклад, *айтэм* (англ. *item*), але, як бачна, у беларускай мове словы адаптуюцца, набываючы асаблівасці мовы. Яшчэ прыклады запазычанняў з англійскай мовы, што замацавалюя ў беларускай лексічнай сютэме: *геймер, кібэрматч, кіберспартсмен, спэл, лут, фраг, асіст, чытар, ульта, скіл, лайн, дроп, ган, буст, пінг, лайнап.* Запазычванне, на наш погляд, карысна, паколькі геймеры з розных краін, хто гаворыць на замежных мовах, маюць магчымасць у такім выпадку лягчэй разумець адзін аднаго і з лёгкасцю запамінаць спецыяльныя словы.

Адным з найважнейшых этапаў развіцця беларускай мовы стала атрыманне эксклюзіўнага права для Беларускай федэрацыі кіберспорту на трансляцыю на беларускай мове турніра The International 11 па Dota 2 – найбуйнейшай падзеі ў свеце кіберспорту [5]. Беларускамоўны эфір паказаў добры вынік па праглядах, і, як вынік, усе самыя вялікія мерапрыемствы таксама атрымалі эфіры на беларускай мове. Але і па другіх мерапрыемствах, такіх, анпрыклад, як CS:GO, CS 2 і VALORANT, праводзяцца беларускамоўныя трансляцыі.

Кажучы пра камунікацыю паміж удзельнікамі кіберспорту ў звычайных матчах, рэдка можна сустрэць геймера, які размаўляе на беларускай мове, але многія з іх добра яе ведаюць. Важна адзначыць, што кіберспорт аб'ядноўвае беларусаў, ствараючы глабальную анлайн-супольнасць, дзе камунікацыя адбываецца на роднай мове. Гэта дапамагае ва ўзмацненні найперш у нацыянальным аспекце кіберспорту і пазіцыянуе беларускую мову як эфектыўны інструмент сучасных анлайн-зносін. Трансляцыі кіберспартыўных падзей на беларускай мове таксама адыгрываюць важную ролю ў развіцці беларускай моўнай прасторы. Гэтыя трансляцыі спрыяюць папулярызацыі кіберспорту сярод беларускай аўдыторыі і, адпаведна, дапамагаюць адлюстроўваць спецыфіку гэтай сферы на нацыянальнай мове. Такі падыход сцвярджае, што беларуская мова можа паспяхова абслугоўваць усе сферы грамадскага жыцця, уключаючы кіберспорт, і здольна зацікавіць сучасную моладзь.

Такім чынам, кіберспорт узнікае ў беларускай мове не толькі як элемент глабальнай інтэрнэт-культуры, але і як канал для папаўнення лексікону новымі словамі выразамі. Мова гульняў стала адным з механізмаў аб'яднання беларускага грамадства, а трансляцыі гульняў на роднай мове дапамагаюць у яе развіцці.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Киберспорт как официальный вид спорта [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://киберспорт.рф/esport/. – Дата доступа: 26.11.2023.*

*2. Беларуская федерация киберспорта [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cybersport.by/ustav-roo-belorusskaya-federaciya-kibersporta. – Дата доступа: 26.11.2023.*

*3. Официальный сайт Белорусской ассоциации компьютерного спорта [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://bacs.by/. – Дата доступа: 26.11.2023.*

*4. Пятрова, Н. Я. Фарміраванне і развіццё беларускай спецыяльнай лексікі ў галіне сучаснай інфарматыкі і камп'ютарных тэхналогій / Н. Я. Пятрова // Этнокультурный и социолингвистический аспекты в теории и практике преподавания языков в негуманитарных вузах: сб. научн. ст. III Международной научно-практической конференции (30 марта 2023 г.) / Белорусский национальный технический университет; редкол.: И. В. Будько (отв. ред.) [и др.]. – Минск: БНТУ, 2023. – С. 246 – 252.*

*5. БФК проведёт трансляцию The International 11 на белорусском языке [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://procyber.me/dota-2/2022/08/bfk-provedet-translyacziyu-the-international-11-na-belorusskom-yazyke/. – Дата доступа: 27.11.2023.*